Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

*Ліс М.М. (Мінск)*

# ГЕНЕРАЛ ЮЗАФ БЕМ – АДВАЖНЫ БАРАЦЬБІТ ЗА ІДЭАЛЫ (ПАВОДЛЕ КНІЖНАЙ КАЛЕКЦЫІ РАДЗІВІЛАЎ З ФОНДУ ЦЭНТРАЛЬНАЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ імя ЯКУБА КОЛАСА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ)

Як вядома, у фондзе Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі) зберагаецца самы вялікі на тэрыторыі рэспублікі фрагмент бібліятэкі Радзівілаў Нясвіжскай ардынацыі.

З 2005 г. супрацоўнікамі аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў праводзілася даследаванне ў рамках навукова-даследчай работы «Бібліятэка Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў у фондзе ЦНБ НАН Беларусі: вывучэнне саставу і навуковае апісанне дакументаў». Атрыманыя вынікі далі падставу для падрыхтоўкі і выдання серыі каталогаў, што адлюстроўваюць склад гэтага знакамітага кнігазбору. Усяго з 2010 па 2020 г. было выдадзена 14 кніг каталогаў агульнай колькасцю 2389 дакументаў, якія размеркаваны ў храналагічнай паслядоўнасці, пачынаючы з XV ст. Сёння ў выдавецтве чакае свайго выхаду ў свет яшчэ адзін каталог, які ўтрымлівае апісанні 177 кніг. У пэўнай ступені ён з'яўляецца завяршальным, бо адлюстроўвае выданні першай паловы XX ст. Яны фактычна з'яўляюцца апошнімі кніжнымі набыткамі знакамітай бібліятэкі, сведкамі заключнага этапу той велізарнай мэтанакіраванай і інтэнсіўнай працы, што ажыццяўлялася многімі пакаленнямі Радзівілаў па фарміраванні свайго найбагацейшага і ўнікальнага кнігазбору. Пасля 1939 г. бібліятэка Нясвіжскай ардынацыі фактычна ўжо не папаўнялася. Яна, як і ўся маёмасць нясвіжскіх Радзівілаў, была нацыяналізавана і перайшла ва ўласнасць БССР. Аднак праца па выданні каталогаў згаданай серыі на гэтым не спыняецца, наперадзе – новыя каталогі, у склад якіх патрапяць ізноў знойдзеныя кніжныя дакументы, дэфектныя асобнікі (без тытульных аркушаў), а таксама рукапісныя кнігі з гэтага ўнікальнага кнігазбору.

Спынімся на кнігах з храналагічным ахопам за 1901–1930-я гг.

Па-першае, трэба адзначыць іх разнастайную моўную і тэматычную палітру, што, зрэшты, уласціва ўсёй калецыі радзівілаўскіх кніг. Так, пераважная большасць выданняў, амаль тры чвэрці, прыпадае на польскамоўныя кнігі, і гэта зразумела. Сярод іх прысутнічаюць творы як польскіх аўтараў, так і ў перакладзе з іншых моў. Далей ідуць 31 англамоўнае выданне, а таксама 9 кніг на французскай і 8 на нямецкай мовах.

Разнастайнасць тэматыкі адзначанай калекцыі тлумачыцца інтарэсамі і літаратурнымі перавагамі яе былых уладальнікаў. Радзівілы цікавіліся самымі рознымі аспектамі чалавечага быцця і перш-наперш звязаных з найважнейшымі момантамі ў гісторыі Польшчы. Таму не выпадкова, што ў калекцыі прысутнічаюць кнігі, прысвечаныя яе гераічнаму мінуламу, пэўным гістарычным падзеям, знакамітым шляхецкімі родам, яркім самабытным асобам – гонару нацыі. Акрамя таго, тут знаходзяцца творы мастацкай літаратуры, у тым ліку і здабыткі сусветнай класікі, гісторыка-крытычныя і філасофскія даследаванні, даведачная



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

літаратура ў выглядзе энцыклапедый, каталогаў, слоўнікаў, кнігі этнаграфічнага і фальклорнага зместу, апісанні цікавых падарожжаў, публіцыстыка, а таксама іншыя жанры кніжнай культуры.

Што датычыцца межаў распаўсюджвання кнігадрукавання адзначанага перыяду, то яны падаюцца нам даволі шырокімі. У калекцыі можна сустрэць кнігі, выдадзеныя як у Еўропе, так і ў філіялах вядомых еўрапейскіх выдавецтваў далёка па-за яе межамі – у Амерыцы, Канадзе, Індыі.

Наогул, гэта калекцыя, нягледзячы на яе невялікі часавы прамежак (1900–1930-я гг.), утрымлівае надзвычай цікавыя кніжныя дакументы, як у зместавым, пазнавальным і агульнаадукацыйным планах, так і з пункту гледжання іх мастацкага афармлення, якое ў пэўнай ступені адлюстроўвае пануючыя тэндэнцыі ў выяўленчым мастацтве таго часу. І, канешне ж, многія з гэтых асобнікаў, дзякуючы сваім індывідуальным асаблівасцям, даюць нам каштоўныя дадатковыя звесткі і пра бытаванне таго ці іншага экзэмпляра, і пра яго ўладальнікаў.

Апісваючы кнігі з радзівілаўскай калекцыі адзначанага перыяду, мы звярнулі ўвагу на невялічкае па фармаце выданне (18×13 см) на 60 старонках пад назвай «Генерал Юзаф Бем (1794–1850): біяграфічны эскіз у 75-ю гадавіну смерці» [4] аўтарства графа Уладзіміра Бема дэ Казбан (Włodzimierz Bem de Cosban; 1889–1954), якое прысвечана вядомай асобе, таленавітаму ваеначальніку, вынаходніку, палітычнаму і культурнаму дзеячу, нацыянальнаму герою не толькі Польшчы, але і Венгрыі.

Як вынікае з прозвішча аўтара кнігі ды генеалагічных звестак, прыведзеных у «Дадатку», а таксама з іншых інфармацыйных крыніц, Уладзімір Бем дэ Казбан – нашчадак славутага генерала Бема, а менавіта праўнук яго стрыечнага брата па так званай венгерскай лініі. Тым, відаць, у пэўнай ступені можна растлумачыць і яго прыхільнасць да ваеннай справы, якую ён пераняў ад свайго знакамітага продка. Уладзімір Бем дэ Казбан – выпускнік афіцэрскай кавалерыйскай школы ў Пецярбургу, служыў у дывізіёне польскіх уланаў, удзельнічаў у вядомай бітве пад Крэхоўцамі[1] [4, s. 54], быў адзначаны ордэнамі і залатой шабляй, выйшаў у адстаўку ў чыне маёра войска польскага [6]. Акрамя таго, Уладзімір Бем дэ Казбан меў літаратурныя здольнасці. Сведчаннем гэтага можа служыць разгляданая кніжка і іншыя цікавыя публікацыі, прысвечаныя польскай гісторыі, і, перш-наперш, звязаныя з родавай гісторыяй Бемаў.

Кніжка, пра якую ідзе гаворка, складаецца з шасці раздзелаў, кожны з якіх мае сваю назву і распавядае пра адпаведны этап жыцця і дзейнасці генерала Юзафа Бема, і «Дадатка», што ўключае звесткі па генеалогіі роду Бемаў і архіўныя і друкаваныя крыніцы, якія адлюстроўваюць жыццё і дзейнасць гэтай

[1] Крэхоўцы (Крыхаўцы́) – населены пункт пад г. Station Станіславам (цяпер г. Івана-Франкоўск, Украіна), дзе ў ліпені 1917 г. Польскі ўланскі полк у колькасці 400 шабляў прыкрываў адыход расійскіх войск на ўсход пасля паражэння Керанскага і фактычна спыніў два нямецка-аўстрыйскія пяхотныя батальёны і дзве кавалерыйскія эскадры агульнай колькасцю каля 2 тыс. салдат, якія да таго ж мелі падтрымку артылерыі. Іх гераізм быў адзначаны ўзнагародамі, знайшоў водгук і ў прэсе, у тым ліку і нямецкай. Акрамя таго, полк абараняў мясцовых жыхароў ад марадзёраў і гвалтаўнікоў з ліку адступаючага расійскага войска [5].



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

нердынарнай асобы. Акрамя таго, у кнігу ўведзены ілюстрацыйны матэрыял у выглядзе партрэтаў самога генерала, яго бацькоў, выяў месца нараджэння Ю. Бема і іншае, а таксама генеалагічнай табліцы роду Бемаў і карт, што адлюстроўваюць ваенныя аперацыі, якія ажыццяўляліся пры ўдзеле генерала.

Што датычыцца знешняга афармлення асобніка, дык яно ўяўляецца даволі сціплым. Кніга «апранута» ў цвёрды састаўны пераплёт, характэрны для многіх выданняў з кнігазбору Радзівілаў Нясвіжскай ардынацыі адзначанага перыяду. Пераплётныя накрыўкі абклееены паперай з малюнкам пад мармур (зялёна-карычневая колеравая гама). Карашок з сіняга каленкору з залатым лінейным цісненнем, з надпісам па дыяганалі: *«General | Józef Bem».* Капталы адсутнічаюць. Абрэз злёгку таніраваны. На тытульным аркушы прыведзены назва кнігі, прозвішча аўтара, выходныя звесткі і выява лагатыпа выдавецтва. Прамыя ідэнтыфікацыйныя адзнакі, найбольш характэрныя для бібліятэкі Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў: экслібрысы, круглыя і авальныя пячаткі чырвонага колеру ці нумары, прастаўленыя ад рукі чорным чарнілам на 19-й старонцы, у гэтым асобніку адсутнічаюць. Але на карысць таго, што гэта кніжка ўсё ж уваходзіла ў склад бібліятэкі Радзівілаў Нясвіжскай ардынацыі, сведчыць дароўны надпіс аўтара, адрасаваны князю Каралю Радзівілу: *«Księcia Karolowi Radzi-|willowi na pamiątka na-|szego Koleïecstwaw 1*$^{m}$*| p. Ulanów Krechoweckich | i na dowód niezmiennej | dla Niego przyjaźni | afiaruwaje | Bem de Cosban nja | 23/XI 1925» («Князю Каралю Радзівілу на памяць аб нашым каляжанстве ў 1-м п. Крэхавецкіх уланаў і на довад нязменнай да Яго прыязні ахвяруе Бем дэ Казбан 23/XI 1925» )* (пераклад аўтара. – *М. Л.*).

Сярод ускосных адзнак, з дапамогай якіх гэтае выданне ў пэўнай ступені можна аднесці да нясвіжскай радзівілаўскай калекцыі, – авальныя пячаткі бібліятэкі Акадэміі навук БССР: *«БІБЛІЯТЭКА | № R-12803 | Акадэміі Навук БССР»,* што прысутнічаюць на тытульным аркушы і старонцы 17. На нашу думку, такімі пячаткамі маглі пазначацца кнігі з кнігазбору Нясвіжскай ардынацыі, што паступілі ў акадэмічную бібліятэку напярэдадні Другой сусветнай вайны і паспелі прайсці адпаведную бібліятэчную апрацоўку.

Што ж з сябе ўяўляе генерал Юзаф Бем, герой згаданага аповеду, які яшчэ пры жыцці набыў вялікую папулярнасць не толькі сярод прадстаўнікоў польскай нацыі, але і іншых народаў, з якімі яго зводзіў лёс? Вось ужо больш за паўтара стагоддзя памяць пра гэтага чалавека захоўваюць шматлікія публікацыі, у тым ліку і мастацкія творы, энцыклапедычныя выданні, школы, вуліцы і плошчы, што носяць яго імя, вершы і песні, прысвечаныя Ю. Бему, паштовыя маркі, манументальныя помнікі і мемарыяльныя дошкі.

Юзаф Захарыяш Бем, згодна з генеалагічнымі звесткамі, нарадзіўся пад Тарнавам у Галіцыі 13 сакавіка 1794 г. Паходзіў са старажытных польскіх родаў Бемаў ды Глухоўскіх, да таго ж сярод продкаў па лініі бацькі меў венгерскія і рэштку паморска-прускіх каранёў [4, s. 6, 13]. Па словах аўтара кнігі Уладзіміра Бема дэ Казбан, будучы генерал выхоўваўся як сапраўдны паляк – у любові да сваёй Айчыны, павазе да яе гісторыі і традыцый, не забываючыся пры тым і на сваю венгерскую часцінку – заўжды быць яе абаронцам [4, s. 13]. І гэтыя важныя пачаткі, закладзеныя з маленства, мелі, бясспрэчна, вырашальнае значэнне і



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

паўплывалі на весь яго далейшы лёс. За сваё нядоўгае жыццё ён здолеў зрабіць шмат карыснага і як таленавіты стратэг, тэарэтык ваеннай справы, вынаходца, адважны воін, і як барацьбіт за высокародныя ідэалы, звязаныя са свабодай і незалежнасцю Польшчы і іншых краін.

Начаткі адукацыі Юзафа Бема былі закладзены ў Кракаўскай гімназіі, дзе настаўнікі адразу звярнулі ўвагу на яго неардынарныя здольнасці да матэматыкі. Пазней у 15-гадовым узросце ён апынуўся ў Ягелонскім універсітэце, але ў хуткім часе далучыўся да батарэі коннай артылерыі графа Уладзіміра Патоцкага, дзе ўзяў удзел у кампаніі супраць Аўстрыі, потым быў накіраваны ў Варшаву ў кадэцкі корпус, скончыў артылерыйскую школу, удзельнічаў у ваеннай кампаніі 1812 г. у складзе арміі Напалеона. За праяўлены гераізм быў адзначаны высокай узнагародай – ордэнам Ганаровага легіёна. Пасля паражэння Напалеона вярнуўся ў Польшчу, уступіў у рэарганізаваную расійскім царом Аляксандрам польскую армію. Некаторы час чытаў лекцыі па ваенных навуках у артылерыйскім вучылішчы ў Варшаве. Паралельна Юзаф Бем займаўся навуковай працай па распрацоўцы кангрэўных ракет, праводзіў выпрабаванні. Падчас аднаго з такіх выпрабаванняў быў паранены, атрымаў моцны апёк. Пазней, абапіраючыся на свае тэарэтычныя распрацоўкі і іх практычнае ажыццяўленне, падрыхтаваў і выдаў кнігу на французскай мове, прысвечаную баявым ракетам, пад назвай «Notes sur les fusee sincen diaries» (1820), якая была перакладзена і на нямецкую мову. За ўдзел у дуэлі са старшым па званні афіцэрам, а таксама па прычыне недобранадзейнасці быў звольнены з войска. Некаторы час па запрашэнні Францішка Патоцкага Ю. Бем жыў у Бродах. Там у поўнай меры высвеціўся яго інжынерны талент, што вельмі пазітыўна адбілася на гаспадарчай сферы Патоцкіх. У гэты ж час Бемам была падрыхтавана і выдадзена яшчэ адна праца – дапаможнік па механіцы паравых машын «O Machinach parowych» (1829). І яшчэ шмат чаго карыснага магла б прынесці стваральная праца гэтага таленавітага, неардынарнага чалавека, але вестка пра варшаўскае паўстанне ў лістападзе 1830 г. адразу выхапіла яго з паўсядзённых свецкіх спраў, і ён апынуўся ў гушчары рэвалюцыйных падзей, спачатку ў якасці камандзіра коннай батарэі, а потым і галоўнакамандуючага ўсёй польскай артылерыі. За праяўлены гераізм і вайсковае майстэрства быў узнагароджаны залатым крыжам і атрымаў званне брыгаднага генерала [1].

Пасля падаўлення паўстання Ю. Бем апынуўся ў Германіі, а потым перабраўся ў Парыж, дзе адразу дачыніўся да грамадска-культурнага жыцця польскай эміграцыі. Дзейсны па натуры, ён быў суарганізатарам Гісторыка-літаратурнага таварыства польскай дыяспары, арганізаваў Польскае палітэхнічнае таварыства (1835), у задачу якога ўваходзіла адукацыя эмігранцкага польскага асяроддзя, удасканальванне і назапашванне ведаў з тым, каб у перспектыве перанесці іх на родную глебу. У гэтым ён таксама прадэманстраваў сябе як сапраўдны стратэг, улюбёны ў сваю краіну. Шмат увагі Ю. Бем надаваў і самаўдасканальванню: вучыўся ў горнай школе, набываў веды па будаўніцтве дарог і мастоў, вывучаў гісторыю суседніх з Францыяй краін з пункту гледжання іх палітычнага і ваеннага становішчаў, маючы на мэце стварэнне польскай арміі, напрыклад у Бельгіі ці Партугаліі. У гэты ж час ім былі напісаны некалькі прац,



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

пад псеўданімам «Глухоўскі», прысвечаных гісторыі Польшчы, у тым ліку і Лістападаўскаму паўстанню, дзе, як адзначае Бем дэ Казбан, Юзаф Бем аналізуе вынікі паўстання і не губляе веры на яго ажыццяўленне ў будучым [4, s. 23–24].

Свабодалюбівы дух барацьбіта не мог надоўга заставацца нерэалізаваным, ён прагнуў новых дзеянняў. Так званая Вясна народаў (еўрапейскія рэвалюцыі, якія пачаліся ў студзені 1848 г. на Сіцыліі, распаўсюдзіліся на шматлікія краіны Еўропы і мелі антыфеадальны і нацыянальна-вызваленчы характары) [3], поўнасцю захапіла Ю. Бема. У паўстанні 1848 г. у Вене ён удзельнічаў у якасці галоўнага арганізатара супраціву ўрадавым войскам. Пасля яго падаўлення апынуўся ў Венгрыі і адразу прымкнуў да паўстанцаў, бо не быў абыякавым да іх лёсу, адчуваў сябе іх часцінкай і заўсёды памятаў пра свае венгерскія карані. Дзякуючы высокім прафесійным якасцям (ён быў назначаны вярхоўным галоўнакамандуючым венгерскай арміі) і адвазе, Ю. Бем здабыў заслужаную славу і сярод ваяроў, і сярод венгерскага насельніцтва, зрабіўся іх нацыянальным героем. У пацвярджэнне гэтага прывядзем словы, змешчаныя ў згаданай кнізе У. Бема дэ Казбан, якія належаць вядомаму грамадска-палітычнаму дзеячу, барацьбіту за незалежнасць Венгрыі Лаяшу Кошуту (1802–94) [2], выказаныя ім у адрас генерала Бема: «...Імя тваё зрабілася неаддзельным ад венгерскай гісторыі: назаўжды з ёй злучаным...» (пераклад аўтара – *М. Л.*) [4, s. 36]. Ю. Бем быў адзначаны адметнай узнагародай, найвышэйшым ордэнам Венгрыі – вялікім крыжам з зоркай, аздобленай дыяментам, вынятым з кароны святога Сцяпана. Замест яго ў карону была ўстаўлена таблічка з імем Юзафа Бема, тым самым быццам сцвярджаючы, што Ю. Бем быў найдаражэйшым дыяментам для венгерскай кароны [4, s. 38].

Нягледзячы на самаадданасць і гераізм, венгерскія паўстанцы пацярпелі паражэнне аднашмат перавышаўшых іх аб'яднаных сіл аўстра-расійскай арміі. Ю. Бем з рэшткай польскага легіёна вымушаны быў пакінуць межы Венгрыі.

Апынуўшыся ў Турцыі, ён у сілу пэўных абставінаў прыняў іслам і атрымаў імя Мурад-паша. Султан, высока ацэньваючы заслугі Ю. Бема, надаў яму званне фельдмаршала і даручыў рэарганізацыю турэцкай арміі, але ў хуткім часе па патрабаванні Расіі і Аўстрыі Ю. Бем быў інтэрнаваны ў Сірыю, у Алепа. Нягледзячы на пэўныя абмежаванні, ён і ў гэтых не надта спрыяльных умовах не мог заставацца бяздзейсным і зрабіў шмат карыснага для Асманскай імперыі і ў ваенным, і ў гаспадарча-эканамічным планах, а таксама незадоўга да смерці правёў выдатную баявую аперацыю пад Алепа па абароне мясцовага насельніцтва.

10 снежня 1850 г. Юзаф Бем у выніку хваробы (фебрыльнай ліхаманкі) скончыў свой зямны шлях і быў з ушанаваннем пахаваны на турэцкіх могілках у Алепа [4, s. 44]. З цягам часу, у 1918 г., яго прах быў перавезены на радзіму і, нягледзячы на пэўныя арганізацыйныя цяжкасці, знайшоў супакой у пахавальні на спецыяльна збудаваным пасярод возера штучным востраве ў парку роднага Тарнава.

ЛІТАРАТУРА

1. **Беларуская** энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і [інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1996–2004. – Т. 8 : Канто – Кул. – 1999. – 576 с.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

2. **Бем, Юзеф Захариаш** [Электронный ресурс] // Wikizero. – Режим доступа: https://www.wikizero.com/ru/%D0%91%D0%B5%D0%BC,_%D0%AE%D0%B7%D0%B5%D1%84_%D0%97%D0%B0%D1%85%D0%B0%D1%80%D0%B8%D0%B0%D1%88. – Дата доступа: 02.03.2020.

3. **Вясна** народаў [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%92%D1%8F%D1%81%D0%BD%D0%B0_%D0%BD%D0%B0%D1%80%D0%BE%D0%B4%D0%B0%D1%9E. – Дата доступу: 02.03.2020.

4. **Bem de Cosban, W.** Generał Józef Bem, 1794–1850; szkic biograficzny w 75-tą rocznicę śmierci / Włodzimierz Bem de Cosban. – Lwów ; Warszawa ; Kraków : Wydawnictwo Zakładu Narod. im. Ossolińskich, 1925. – 57, [3] s., [3] ark. tab. ; il., tab.

5. **Bitwa** pod Krechowcami [Zasoby elektroniczne] // Wikipedia. – Tryb dostępu: https://pl.wikipedia.org/wiki/Bitwa_pod_Krechowcami. – Data dostępu: 26.02.2020.

6. **Wojciechowski, J. S.** Polsko-węgierskie symbole pamięci generała Józefa Bema [Zasoby elektroniczne] / Wojciechowski J. S. – Tryb dostępu: http://bazhum.muzhp.pl/media//files/Niepodleglosc_i_Pamiec/Niepodleglosc_i_Pamiec-r2010-t17-n1_(31)/Niepodleglosc_i_Pamiec-r2010-t17-n1_(31)-s89-97/Niepodleglosc_i_Pamiec-r2010-t17-n1_(31)-s89-97.pdf. – Data dostępu: 24.02.2020.

*Рассматривается фрагмент книжной коллекции (1900–1930-е гг.) Несвижской ординации Радзивиллов из фонда Центральной научной библиотеки НАН Беларуси, дана краткая характеристика. Акцент сделан на издании, посвященном жизни и деятельности неординарного человека, талантливого военачальника, национального героя Польши и Венгрии Юзефа Бема (1794–1850).*

*The article discusses a fragment of the book collection (1900–1930s) of the Nesvizh ordination of the Radziwills from the fund of the Central Scientific Library of the National Academy of Sciences of Belarus, gives a brief description. The emphasis is on the publication dedicated to the life and work of an extraordinary person, a talented military leader, national hero of Poland and Hungary, Jozef Bem (1794–1850).*

***Жук Т.І.*** *(Мінск)*

## ЯНКА ШУТОВІЧ І ЯГО ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ СПАДЧЫНА Ў ФОНДЗЕ АДДЗЕЛА РЭДКІХ КНІГ І РУКАПІСАЎ ЦЭНТРАЛЬНАЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ імя ЯКУБА КОЛАСА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

У 1968 г. у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі) у аддзеле рэдкіх кніг быў створаны сектар рукапісаў. Была разгорнута інтэнсіўная работа па камплектаванні фонду рэдкімі і каштоўнымі рукапіснымі дакументамі, якія ў асноўным былі сканцэнтраваны ў фондах асабістага паходжання. У 1970-я гг. бібліятэка набыла архівы вядомых вучоных, акадэмікаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі М. Мацапуры (1908–



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by